ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ДВАРЭЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

# Інфармацыйная гадзіна
# “Навіны спорту”

## (інфармацыя+)

Падрыхтавала:
Класны кіраўнік IV класа
Азеева Вераніка Уладзіміраўна
16.12.2019 г.

2019 г.

**Дата правядзення:** 16 снежня 2019

**Клас:** IV

**Класны кіраўнік:** Азеева Вераніка Уладзіміраўна

**Месца правядзення:** кабінет 4 класа

**Час правядзення:** 8.30 – 9.00

**Тэма:** Навіны спорту

**Форма:** інфармацыя +

**Мэта:** выхаванне любві да спорту, пачуццё патрыятызму, пачуццё гонару за дасягненні ў спорце айчынных спартсменаў.

**Задачы:**

1. дапамагчы навучэнцам арыентавацца ў патоку падзей, якія адбываюцца ў краіне.
2. даведацца пра алімпійскія гульні, гісторыю іх ўзнікнення.
3. выхоўваць любоў на спорту.

**Афармленне, абсталяванне:** эмблема алімпійскіх гульняў, карткі з датамі, заданне для віктарыны.

План правядзення

## I. Арганізацыйны момант

- Добры дзень. Сення з вамі на інфармацыйнай гадзіне мы пагаворым пра спорт, а дакладней пра Алімпійскія гульні, якія праходзілі у прошлым годзе ў нашай краіне.

## II. Вызначэнне тэмы. Гутарка.

На дошцы вісіць эмблема алімпіскіх гульняў. Напісы дэвіз алімпійскіх гульняў.

- Хто ведае, што гэта за малюнак такі? А што за словы напісаныя на дошцы?

- Гэта, дзеці, эмблема і дэвіз Алімпійскіх гульняў.
- Сення мы павінны успомніць усе нашы веды пра спорт, пра нашых спартсменаў і даведацца, якіх дасягненняў яны змаглі дабіцца на Зімовых Алімпійскіх гульнях.
- Хто ведае, што такое Алімпійскія гульні?

**Гісторыя ўзнікнення.**

Традыцыя правядзення Алімпійскіх гульняў, якая існавала ў Старажытнай Грэцыі, зарадзілася як частка рэлігійнага культу. Гульні праводзіліся з 776 да н. э. па 394 н. э., усяго было праведзена 293 Алімпіяды ў Алімпіі, якая лічылася ў грэкаў святым месцам. Ад Алімпіі адбылася і назва гульняў.

Сучасныя Алімпійскія гульні былі адроджаны ў канцы XIX стагоддзя французскім грамадскім дзеячам П'ерам дэ Кубертеном (на дошцы яго партрэт). Алімпійскія гульні, вядомыя таксама як летнія алімпійскія гульні, праводзіліся кожныя чатыры гады, пачынаючы з 1896 года, за выключэннем гадоў, якія прыйшліся на сусветныя войны. У 1924 годзе былі заснаваны зімовыя Алімпійскія гульні, якія першапачаткова праводзіліся ў той жа год, што і летнія. Аднак, пачынаючы з 1994 года, час правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў ссунуты на два гады адносна часу правядзення летніх гульняў.

Праз некалькі дзён пасля правядзення Алімпійскіх гульняў на тых жа спартыўных збудаваннях прымаюцца Паралімпійскія гульні для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

- А хто ведае эмблему Алімпійскіх гульняў? (на дошцы малюнак эмблемы, разгортваецца калі дзеці ведаюць)
- А хто ведае, што абазначае кожны з калец?

**Пра эмблему.**

Афіцыйная алімпійская эмблема складаецца з: алімпійскага сімвала - пяць пераплеценых кольцаў сіняга, жоўтага, чорнага, зялёнага і чырвонага колераў на белым фоне.

Распрацаваны гэты сімвал самім заснавальнікам сучасных Алімпійскіх Гульняў - баронам П'ерам дэ Кубертеном ў 1913 годзе. Ідэя была ім ўзятая з малюнкаў падобных кольцаў на старажытна грэцкіх прадметах. Па версіі дэ Кубертэна, кольцы ўвасабляюць адзінства пяці кантынентаў і сустрэчуспартспенаў усяго свету на Алімпійскіх гульнях, Сімвалізуюць пяць населенных частак свету, якія жадаюць удзельнічаць у Алімпійскім рухуі прымаюць здаровую спартыўную канкурэнцыю. Пры гэтым першапачаткова не выказвалася прывязка колераў кольцаў да пэўных кантыненаў.

- А хто з вас ведае, якія гульні праходзілі апошнія, летнія ці зімнія?Якія яны былі па ліку? А дзе? А калі пачаліся і скончыліся?(XXIII Зімовыя Алімпійскія гульні адбываліся з 9 па 25 лютага 2018 года на алімпійскіх аб'ектах, размешчаных у павеце Пхёнчхан, Рэспубліка Карэя.)
- Ці ўдзельнічала Рэспубліка Беларусь у гэтай алімпіядзе?
- А якіх беларускіх спартсменаў вы ведаеце, якія ўдзельначалі у гэтай алімпіядзе?

**III. Праверка дамашняга задання.**

- А зараз мы праверым ваша хатнее заданне. Вам трэба было знайці навіны пра алімпійскія гульні, звязаныя з нашымі спартсменамі, якіх дасягненняў яны змаглі дабіцца на алімпійскіх гульнях.

Праверка задання. Кожны вучань падыходзіць да дошкі і расказвае сваю навіну. На дошцы заісваюцца імены спартсменаў, медалі і від спорту.

- Вы малайцы, я бачу, што ўсе прыйшлі сення падрыхтаваныя.

## IV. Праверка набытых ведаў.

- Давайце яшчэ раз нагадаем, пра што была наша сенняшняя інфармацыйная гадзіна. Правядзем хуткую віктарыну.

1. Якія бываюць алімпіскія гульні?
2. Якакі прамежак паміж імі?
3. Якая эмблема Алімпійскіх гульняў?
4. Дзе праходзілі Зімовыя Алімпійскія гульні ў 2018 годдзе?
5. Колькі і якія медалі прывезлі нашы спартсмены?
6. Якіх беларускіх спартсменаў вы ведаеце?

## V. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія.

- Ці спадабаўся вам наш сенняшні ўрок? Чым?
- Ці даведаліся вы што-небудзь новае? Што?
- Дзякуй за урок.

**Літаратура:**


1. Белорусский портал [Электронный ресурс]/ ООО «Тут бай медиа». – Минск, 2000. – Режим доступа : https://www.tut.by/. – Дата доступа: 14.12.2019
2. Беларусь 24 [Электронный ресурс]/ Режим доступа: https://belarus24.by/articles/lyudi/sportsmeny-belarusi-chast-1/. – Дата доступа: 14.12. 2019